10. *Dobbs, A. E.* Education and social movement. 1700–1850 / A. E. Dobbs. – London: Longmarms, 1919. – 257 p.
11. Editorial // Morning Post. – 1840. – 26 May. – P. 3.
12. Education Bill by J. Russel // The Times. –1855. – 13 Febr. – P. 4.
13. Education Bill // HPD. Ser. 3 rd. – London, 1855. – Vol. 137. – Col. 641–686.
14. Education // Hansard's Parliamentary Debates (далее: HPD). Ser. 3 rd. – London, 1833. – Vol. 20. – Col. 733–736.
15. Education of Factory Children // HPD. Ser. 3 rd. – London, 1843.– Vol. 67. – Col. 422–445
16. Minutes of the Committee of Council on Education dated August, 1840 // Educational documents. England Wales, 1816 to the present day // Ed. by J. S. Maclure. – London, 1974. – 378 p.
17. National Education // Annual Register. – London, 1839. – Vol. 81. – Chapter XII. – P. 217–234.
18. National Education // Annual Register. – London, 1840. – Vol. 82. – Chapter VII.– P. 140–172.
19. Order in Council dated August 10 th., 1840 // Educational Documents England and Wales, 1816 to the present day // Ed. by J. S. Maclure. – London, 1974. – P. 46–47.
20. Report of the Commissioners appointed to inquire into the State of Popular Education in England (The Newcastle Report) // Educational Documents England and Wales. 1816 to the present day // Ed. by J. S. Maclure, – London, 1974. – P. 70–78.
21. Rules and Objects of the National Association for Promoting the Political and Social Imppovement of the People // British working class movements. Select Documents. 1789–1875 / Ed. by G. D. H. Cole and A. W. Filson. – London: Macmillan, 1951. – P. 380–381.

УДК 008.009:39

# ПРАЕКТ «АДЗІН ПОЯС – АДЗІН ШЛЯХ» КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ ЯК ФАКТАР УМАЦАВАННЯ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

**А. Ф. Паддубская**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Paddubskaya@bsu.by*

У артыкуле аналізуецца станаўленне і развіццё кітайскай ініцыятывы «Адзін пояс – адзін шлях» (АПАШ), асноўныя фактары яе вылучэння, матывы і мэты. Раскрываецца эвалюцыя ініцыятывы АПАШ, якая прэтэндуе на ролю новага механізму глабалізацыі, новай ідэалогіі глабалізму з лозунгам «будаўніцтва супольнасці адзінага лёсу чалавецтва». Асаблівая ўвага надаецца аналізу праблем і перспектыў праекта «Адзін пояс – адзін шлях».

***Ключавыя словы:*** «Адзін пояс – адзін шлях; еўразійская інтэграцыя; супрацоўніцтва; Кітай; Еўразія.

# ПРОЕКТ КИТАЙСКОЙ НАРОДНОЙ РЕСПУБЛИКИ «ОДИН ПОЯС – ОДИН ПУТЬ» КАК ФАКТОР УКРЕПЛЕНИЯ ЕВРАЗИЙСКОЙ ИНТЕГРАЦИИ

**Е. Ф. Поддубская**

*Белорусский государственный университет, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 4, Paddubskaya@bsu.by*

В статье анализируется становление и развитие китайской инициативы «Один пояс – один путь» (ОПОП), основные факторы ее выдвижения, мотивы и цели. Раскрывается эволюция инициативы ОПОП, претендующая на роль нового механизма глобализации, новой идеологии глобализма с лозунгом «строительства сообщества единой судьбы человечества». Особое внимание уделяется анализу проблем и перспектив проекта «Один пояс, один путь».

***Ключевые слова:*** «Один пояс – один путь; евразийская интеграция; сотрудничество; Китай; Евразия.

# THE PROJECT “ONE BELT ONE ROAD” OF THE PEOPLE'S REPUBLIC OF CHINA AS A FACTOR FOR STRENGTHENING EURASIAN INTEGRATION

**A. F. Paddubskaya**

*Belarusian State University, 4 Nezalezhnosti Ave., Minsk, 220030, Paddubskaya@bsu.by*

The article analyses the formation and development of the Chinese initiative “One belt, One road” (OBOR), the main factors of its promotion, motives and goals. It reveals the evolution of the initiative “One belt, One road”, which claims to be the new mechanism of globalisation, the “concept of global governance”, the new ideology of globalism with the slogan “building a community of the common destiny of humanity”. Particular attention is paid to the analysis of problems and the perspective of the OBOR project.

***Keywords:*** “One Belt; One road”; Eurasian integration; cooperation; China; Eurasia.

Новы этап глабалізацыі эканомікі на пачатку XXI ст. падштурхоўвае нацыянальныя дзяржавы шукаць кампраміс паміж захаваннем палітычнага суверэнітэту, кантролю над рэсурсамі, фінансавымі і інфармацыйнымі патокамі і неабходнасцю ўдзельнічаць у наднацыянальных інстытутах: ваенна-палітычных блоках, эканамічных саюзах і міжнародных інструментах развіцця.

Глабалізацыя не прывяла да зніжэння інтэнсіўнасці рэгіянальных інтэграцыйных працэсаў, наадварот – гэтыя працэсы прыкметна актывізаваліся. Сталі фармавацца новыя міжнародныя макрарэгёны з цеснымі ўнутранымі палітычнымі і эканамічнымі сувязямі.

Адным з найноўшых і маштабных інтэграцыйных праектаў з'яўляецца ініцыятыва КНР «Адзін пояс – адзін шлях», якая была ўпершыню агучана

лідэрам КНР Сі Цзіньпінам падчас візітаў у Казахстан і ў Інданезію восенню 2013 года.

Першапачаткова кітайская канцэпцыя праследавала пераважна эканамічныя задачы, уяўляла сабой набор інфраструктурных праектаў, якія ахоплівалі Еўразійскі кантынент [2, С. 113]. Заяўленай мэтай праекта аб’яўлялася стварэнне новых механізмаў эканамічнага развіцця, якія будуць садзейнічаць больш эфектыўнаму размеркаванню рэсурсаў у рэгіёне і ўмацаванню рыначнай інтэграцыі паміж дзяржавамі [6], што павінна было ў выніку прывесці да фарміравання і прасоўвання новай мадэлі міжнароднага супрацоўніцтва і эканамічнага развіцця з дапамогай умацавання дзеючых рэгіянальных двухбаковых і шматбаковых механізмаў і структур з удзелам Кітая.

Паступова адбылося ўдакладненне мэтавых установак і задач ініцыятывы, якія выйшлі ў працэсе рэалізацыі за рамкі першапачатковай задумы. Прыкметнае месца ў ёй занялі пытанні забеспячэння міру, бяспекі, супрацоўніцтва ў сферы культуры і г. д. Ініцыятыва «Адзін пояс – адзін шлях» паўстала як інавацыйная, глабальная стратэгічная канцэпцыя, якая зможа сфарміраваць новыя інстытуты, практыкі, механізмы глабальнага развіцця. Праект стаў пазіцыянавацца як канцэптуальная праграма, якая садзейнічае развіццю сусветнай эканомікі, як адказ на выклікі сучаснага свету, «механізм фарміравання новага міжнароднага парадку», «новага парадку Шаўковага шляху», які мае эканамічны, палітычны і культурны патэнцыял інтэграцыі [12, С. 67; 5, С. 733; 4, С. 116].

У цяперашні час мэты Пекіна ў «Адзін пояс – адзін шлях» фармулююцца яшчэ больш амбіцыйна – адным з найважнейшых тэзісаў праекта з'яўляецца палажэнне аб будаўніцтве «супольнасці адзінага лёсу чалавецтва» [9, С. 241; 10, С. 241]. Пры гэтым «супольнасць адзінага лёсу» – гэта мэта; агульныя інтарэсы – аснова; супрацоўніцтва і ўзаемны выйгрыш – прынцып; кансультацыі і сумеснае будаўніцтва – галоўныя спосабы распрацоўкі палітыкі сувязяў і ўзаемадзеянняў спалучэння з рэальнымі патрэбамі краін.

Іншымі словамі, ініцыятыва «Адзін пояс – адзін шлях» становіцца кітайскім варыянтам праекта глабалізацыі.

У стратэгіі «Адзін пояс – адзін шлях» дэкларуюцца такія прынцыпы міжнароднага супрацоўніцтва як: шматбаковасць, узаемадапаўняльнасць і інклюзіўнасць супрацоўніцтва.

Шматбаковасць выяўляецца ў тым, што адносіны паміж дзяржавамі раўнапраўныя, супрацоўніцтва перасякаецца. Узаемадапаўняльнасць разглядаецца як магчымасць абмена ў сферах рэсурсаў, капіталу і тэхналогій для дасягнення ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і агульнага развіцця. Су-

працоўніцтва ў рамках праекта можа садзейнічаць мадэрнізацыі прамысловай структуры краін, якія сталі на шлях развіцця, з дапамогай перадачы тэхналогій Інклюзіўнасць выяўляецца ў тым, што рэалізацыя ініцыятывы «Адзін пояс – адзін шлях» не прывядзе да выключэння і канкурэнцыі з існуючымі механізмамі супрацоўніцтва (ШАС, ЕАЭС і г. д.), а надасць новыя сілы гэтым механізмам.

Маштабнасць праекту (па стану на сакавік 2022 года, КНР падпісала пагадненні аб супрацоўніцтве ў межах ініцыятывы «Адзін пояс – адзін шлях» з 148 краінамі і 31 міжнароднай арганізацыяй [11, С. 22]) выклікала інтарэс з боку палітычных і эканамічных эліт, навуковай супольнасці і сродкаў масавай інфармацыі з усяго свету.

Аднак, у 2019–2021 гг. навукоўцы (у тым ліку і кітайскія) пачалі заклікаць больш аб'ектыўна ўлічваць унутраную і знешнюю абстаноўку для рэалізацыі практычных праектаў плана «Адзін пояс – адзін шлях». Паўстала больш глыбокае разуменне, што прыцягнуць усе краіны да рэалізацыі праекту, вельмі складана [3, С. 71].

Праект «Адзін пояс – адзін шлях» сутыкнуўся з шэрагам праблем. Кожная з краін-удзельніц мае свае асаблівыя расавыя, рэлігійныя, культурныя, эканамічныя, прававыя і палітычныя характарыстыкі, што часта могуць перашкаджаць іх аб'яднанню ў адзіны эканамічны праект [8, С. 140].

У марскім сектары для рэалізацыі кітайскага плана патрабуецца падпісанне шматлікіх пагадненняў паміж Пекінам і Асацыяцый краін Паўднёва-Усходняй Азіі, а таксама Еўрапейскім саюзам. З іншага боку, ёсць шэраг краін, у мытных пагадненнях якіх усё яшчэ не ліквідаваныя бар'еры для свабоднага гандлю, што ўскладняе дасягненне мэтаў Кітая па рэалізацыі праекта «Адзін пояс – адзін шлях».

Яшчэ адзін выклік рэалізацыі праекта звязаны з праблемамі бяспекі. Паспяховая рэалізацыя праекта і інтэграцыя краін-удзельніц суправаджаецца непрадказальнымі рызыкамі, звязанымі з ростам канфліктаў і нестабільнасці ў свеце, якія ствараюць перашкоды для рэгіянальнага супрацоўніцтва [7, С. 174]. Прысутнасць тэрарыстычных груп (такіх, напрыклад, як ІДЗІЛ – ісламская дзяржава (Ісламская дзяржава Іраку і Леванту) – транснацыянальная вайскова-тэрарыстычная арганізацыя, заснаваная ў кастрычніку 2006 году ў іракцкім горадзе Бакуба), сур'ёзна ўскладняе рэгіянальнае супрацоўніцтва [1, С. 120]. Важна, што ўдзел шырокага спектра краін і міжнародных арганізацый дасць магчымасць забяспечыць рэгіянальную бяспеку шляхам сумеснай барацьбы з тэрарыстычнымі пагрозамі, у чым, без сумнення, зацікаўлены ўсе ўдзельнікі ініцыятывы, у тым ліку і Беларусь.

Акрамя таго, знешнепалітычная сітуацыя ў еўразійскім рэгіёне пастаянна мяняецца, «Адзін пояс і адзін шлях» не з'ўляецца адзіным праектам

еўразійскай інтэграцыі: функцыянуюць розныя рэгіянальныя аб'яднанні рознай ступені глыбіні ўзаемадзеяння і шыраты сфер рэгулявання, што стварае канкурэнцыю для ініцыятывы.

Такім чынам, ідэалогія праекта «Адзін пояс – адзін шлях» з'яўляецца вынікам эвалюцыі знешнепалітычных дактрын КНР і адпавядае ўзрослай ролі Кітая ў сусветнай эканоміцы. Канцэпцыя праекта «Адзін пояс – адзін шлях» прасоўвае ідэал свабодных раўнапраўных адносін і глабальнай адкрытасці, пазіцыянуючы сябе як альтэрнатыву заходняй мадэлі мадэрнізацыі і кансерватыўнаму антыглабалізму. Рэалізацыя ініцыятывы будзе садзейнічаць усталяванню сувязей і эканамічнаму росту ў яшчэ большым дыяпазоне ў еўразійскім рэгіёне.

Адзначаецца, што ўдзельнікі праекта «Адзін пояс – адзін шлях» павінны ідэнтыфікаваць сябе ў перспектыве з пэўнай «глабальнай транснацыянальнай супольнасцю», якая аб'ядноўвае людзей з рознай этнічнай або грамадзянскай прыналежнасцю.

У цэлым ідэалогія праекта «Адзін пояс – адзін шлях» першапачаткова выклікала ў свеце вялікую цікавасць, што можна растлумачыць як матэрыяльнай зацікаўленасцю розных эканамічных і палітычных сіл, так і арыгінальнасцю ідэйнай канструкцыі праекта. Аднак, за дастаткова невялікі тэрмін прайшла ў навуковым дыскурсе шлях ад адназначнай цікавасці і ўсведамлення важнасці супрацоўніцтва ў межах «Аднаго поясу – аднаго шляху» да заяў аб неабходнасці больш дэталёвага вывучэння выклікаў і перашкод праекту, рашэння эканамічных праблем і эфектыўнасці палітычнага ўзаемадзеяння паміж краінамі-ўдзельніцамі ініцыятывы.

Прымаючы да ўвагі існуючыя і патэнцыйныя рызыкі і выклікі, якія стаяць перад ініцыятывай «Адзін пояс – адзін шлях», пастаянна павінны ўдасканальвацца механізмы ўзаемадзеяння ўнутры ініцыятывы, прававыя рамкі, практыкі кіравання і тэхналагічныя рашэнні. Толькі стварыўшы арыгінальныя, эфектыўна працуючыя інстытуты, праект АПАШ можа дасягнуць поспеху і рэалізаваць пастаўленыя перад ім задачы.

## Бібліяграфічны спіс


1. *Гасанов, К. Н.* Проблемы обеспечения безопасности маршрута «Нового шелкового пути» через Центральноазиатский регион / К. Н. Гасанов // Постсоветские исследования. – 2020. – № 2. – 116–123. С. 120.

2. *Дэкунь, Кун* Евразийская интеграция Китая в рамках инициативы «Один пояс и один путь» / Кун Дэкунь // Теории и проблемы политических исследований. – 2018. – Том 7. – № 2. – С. 112–121. С. 113).

3. *Ижу, Лю, Авдокушин, Е. Ф.* Проект «Один пояс, один путь» 2.0 – стратегия стимулирования глобальной экспансии Китая / Лю Ижу, Е. Ф. Авдокушин // Мир новой экономики. – 2019. – № 13(1). С. 67–76.

4. *Занг, Динь Ле Хонг* Китайская инициатива «Пояс и путь» и ее влияние на формирование новой системы международных отношений / Динь Ле Хонг Занг // Ученые записки Крымского федерального университета имени В. И. Вернадского Философия. Политология. Культурология. – 2019. – № 4. – С. 115–124 . – С. 116.
5. *Зиниша, О. С.* Новый «шёлковый» мировой порядок: мечта или реальность? / О. С. Зиниша // Экономика и социум. – 2016. – № 4. – 730–735. С. 733.
6. *Кулинцев, Ю.* «Один пояс – один путь»: инициатива с китайской спецификой [Электронный ресурс] / Ю. Кулинцев. – Режим доступа: https://russiancouncil.ru/blogs/riacexperts/_1868/. – Дата доступа: 04.09.2023
7. *Розов, Н. С.* Китайский проект «Один пояс и .один путь» в контексте парадигм исторической макросоциологии / Н. С. Розов // Вестник Новосибирского государственного педагогического университета. – 2018. – Т. 8. – № 1. – С. 173–188.
8. *Сереков, Б. А.* Китайский проект «Один пояс – один путь»: проблемы и перспективы реализации / Б. А. Сереков // «Россия и современный мир». – 2018. – № 3. – С. 138–150. С. 140.
9. *Сюань, Цю* Содействие созданию сообщества с единой судьбой с помощью инициативы «Один пояс и один путь» / Цю Сюань // Народный форум. – 2017. – № 36. – С. 36–37.
10. *Цзаньпин, Чжун* «Один пояс – один путь» как новая форма диалога между Китаем и цивилизациями / Чжун Цзаньпин // Ярославский педагогический вестник. – 2018. – № 1. – С. 239–243.
11. *Шупин, Я.* Евразийская инициатива «Большое евразийское партнёрство» и «Один пояс – один путь»: сравнительный анализ / Я. Шупин // Россия вчера, сегодня, завтра. – № 1. – 2023. С. 22. (19–33).
12. *Юнхао, Ван* Основные направления внешней политики Китая в Юго-Восточной Азии: применение инструментов «мягкой силы» / Ван Юнхао // Общество: политика, экономика, право. – 2023. – № 5. С. 62–68. С. 67.

УДК 316-048.35"1950/1969"(476)(091)

# ПРАКТЫКА МАДЭРНІЗАЦЫІ: ГРАМАДСТВА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 50–60-х гг. ХХ ст.

**Н. А. Поляк**

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, пр. Дзяржынскага, 83, г. Мінск, Беларусь, Polyak77@mail.ru*

Мадэрнізацыйны падыход у разглядзе працэсаў мінулага з’яўляецца новым у нашай навукі. Беларускае грамадства другой паловы 50–60-х гг. ХХ ст. адчула на сабе імклівую індустрыялізацыю эканомікі і пражывала істотныя сацыяльна-дэмаграфічныя змены ў выглядзе вылучэння на першыя пазіцыі «суб’ектаў мадэрнізацыі» – рабочага класу. Практыка мадэрнізацыі ў БССР праходзіла супярэчліва і рэалізоўвалася своеасабліва. Цяжкасці, з якімі сутыкнуўся рабочы клас Савецкай Беларусі былі выкліканы надзвычай імклівым дынамізмам развіцця.

***Ключавы словы:*** мадэрнізацыя; эканамічны рост; новаўвядзенні; сацыяльна-дэмаграфічныя змены; рабочы клас; урбанізацыя; школы рабочай моладзі; гатовы да працы і абароны.